DOI: https://doi.org/10.15407/preislamic2021.02.047

UDC 94(394)

**GENERIC THINKING AND IDEOLOGY OF PURITY IN THE WORLDVIEW OF THE JEWISH COMMUNITY IN THE PERSIAN PERIOD (6th–4th CENTURIES BC)**

*H. V. Dziahel*
PhD (History)
Associate Professor
International University "MITSO"
21/3, Kazintsa Str., Minsk, 220099, Belarus
annadjagel@gmail.com

Generic thinking and ideology of purity are some of the key characteristics proper for the worldview of the Jewish community in Palestine during the Persian period. The book of Ezra-Nehemiah shows the strongly expressed generic thinking of the people of Israel. Hence the demand for divorce from non-Jewish wives and the abandonment of children born in mixed marriages. From the point of view of the community leadership, this was the only way of exclusion of "impurities". The boundaries of the community were impenetrable, and their violation endangered ritual purity and the entire community. Israel is a holy seed, all other nations are an ordinary seed. The community separated from the "peoples of the earth", strove for the ritual purity of the priests, for the fulfillment of the Law. The basis of this generic, communal worldview is the ideology of purity. In Nehemiah's book, aliens "ritually" pollute the community through physical presence. In the book of Ezra, pollution is the desecration of "abomination". In a later, antique period, the Jerusalem Second Temple was the core of Jewish ritual purity. Generic thinking was transformed into the concept of ritual purity, not only by the Levites and priests, but also by ordinary members of the Jewish community.

**Keywords:** the ideology of purity, Judea, Persian period, Achaemenid state, the Jewish community, Jewish identity

*Г. В. Дзягель*

# РОДАВАЕ МЫСЛЕННЕ І ІДЭАЛОГІЯ ЧЫСЦІНІ Ў СВЕТАПОГЛЯДЗЕ ІУДЭЙСКАЙ АБШЧЫНЫ Ў ПЕРСІДСКІ ПЕРЫЯД (VI–IV СТСТ. ДА Н. Э.)

У яўрэйскай гісторыі персідскі перыяд з'яўляецца адным з найбольш цёмных, і ў той жа час адным з ключавых для разумення гістарычных працэссаў, якія будуць адбывацца надалей. Падзенне Іудэйскага царства, разбурэнне Першага Храма і Вавілонскі плен аставілі значны след у гістарычнай памяці іудэяў. Сутыкненне яўрэйскага народу з вавілонскай і персідскімі культурамі актуалізавала цікаўнасць да ўласнай гісторыі, пошуку гістарычнага наканавання і боскага плану ў глабальных гістарычных падзеях. Можна сказаць, што персідскі перыяд з'яўляецца той прызмай, праз якую трэба разглядаць увесь біблейскі аповед. Менавіта ў гэты час вялася праца па складанню і рэдактуры Старога Запавету ў цэлым і Пяцікніжжа ў прыватнасці. Рэлігійныя ідэі персідскага перыяду знаходзяцца таксама ў аснове далейшага развіцця постбіблейскага іудаізму. Асновы ідэнтычнасці яўрэйскага народу, якія былі пераасэнсаваны ў разглядаемы перыяд, сталі падмуркам духоўнага жыцця ў наступныя стагоддзі.

Кніга Эзры-Нехем'і як аповед, што апісвае абшчынную ідэнтычнасць, паказвае моцна выяўленае родавае мысленне, згодна з якім народ Ізраіля адрозніваецца ад іншых народаў па свайму паходжанню. Так ўжо ў першых главах кнігі Эзры, у аповедзе пра першую хвалю перасяленцаў з Вавілоніі ў Іудэю гаворыцца, што частка жадаючых вярнуцца "не змаглі назваць род свой і семя свае, – ці з Ізраілю яны" (Эзра 2:59), а святары, што не знайшлі запіс аб сваім паходжанні з святарства, былі выключаны з святарства (Эзра 2:62).

Наступным паказальным эпізодам з'яўляецца скасаванне змяшаных шлюбаў, што апісана ў 9 главе кнігі Эзры. Патрабаванне скасавання шлюбаў з неяўрэйскімі жонкамі і адмова ад дзяцей, што былі народжаныя ў гэтых змяшаных шлюбах, сведчыць, што такія радыкальныя меры былі адзіным спосабам захаваць чысціню абшчыны [Janzen 2007, *49*]. Скасаванне змяшаных шлюбаў мела ў тым ліку рытуальны сэнс: ачышчэнне альбо пакаянне. Іншымі словамі, іудэйская ідэнтычнасць у кнізе Эзры-Нехем'і родавая. Межы, якія аддзяляюць Ізраіль ад іншых народаў, непранікальныя, і іх парушэнне не ўхваляецца. Паводле кнігі Эзры-Нехем'і, тыя, хто спрабуюць уключыць у склад абшчыны Ізраіля неіудэяў, парушаюць рытуальную чысьціню і такім чынам ставяць пад пагрозу ўсю абшчыну.

Якім чынам паняцце чысціні адлюстравана ў тэксце кнігі Эзры-Нехем'і? Перш за ўсе трэба разгледзіць урывак Эзра 9:10–12.

Урывак Эзра 9:10–12 – гэта малітва Эзры пасля таго, як ён даведаўся пра змяшаныя шлюбы:

*«10… аставілі мы запаветы, 11 якія ты запаведваў нам праз рабоў тваіх, прарокаў, сказаўшы: "Зямля, якую вы ідзяце браць у спадчыну, зямля нячыстая з-за нечысціні народаў краін праз мярзоту іх (בְּנִדַּת עַמֵּי הָאֲרָצוֹת בְּתוֹעֲבֹתֵיהֶם נִדָּה הִיא אֶרֶץ), што перапоўнілі яе ад краю да краю нечысцінёй сваёй (בְּטֻמְאָתָם).*

*12 А цяпер, дачок сваіх не аддавайце за іх сыноў, і іх дачок не бярыце за сыноў сваіх…».*

Па-першае, у гэтым тэксце мы бачым адразу тры паняцці, якія азначаюць нечысціню: **תּוֹעֵבָה тоэва**[1] – нечысціня [Strong 1890]**, נִדָּה нидда**[2] – нечысціня [Strong 1890] і **טֻמְאָה** тума[3] – рэлігійная нечысціня [Strong 1890]. Крыніцай гэтай нечысціні, у тым ліку рытуальнай, з'яўляюцца народы краін.

Па-другое, мы бачым абяцанне не браць шлюб з іншымі народамі. Гэта з'яўляецца адным з запаветаў. Што паццвярджаецца ў Нех. 10:30–31:

"*30… і прыйшлі з клятвай і прысягай (у тым), каб прытрымлівацца Торы Божай, якая дадзена была праз Мошэ, раба Яхве, і каб захоўваць і выконваць усе запаведзі Яхве Бога нашага, і законы Ягоныя, і пастановы;*

*31 І каб не аддаваць нам дачок нашых народам зямлі, а іх дачок не браць за сыноў сваіх*".

Гэтыя ўрыўкі не прадугледжваюць ўзаемапранікнення паміж Ізраілем і не-Ізраілем.

Урыўкі Эзра 6:21 і Эзра 9:1 таксама ўказваюць на народы краіны як на крыніцу нечысціні:

---

[1] Нумар Стронга 8441, у Старым Запавеце ўзгадваецца 112 разоў.

[2] Нумар Стронга 5079, у Старым Запавеце ўзгадваецца 24 разы.

[3] Нумар Стронга 2932, у Старым Запавеце ўзгадваецца 31 раз.

"*І елі сыны Ізраілевыя, якія вярнуліся з выгнання, і ўсе, якія адышлі ад нечысціні народаў зямлі (הָאָרֶץ גּוֹיֵ מִטֻּמְאַת) (І якія далучыліся) да іх, каб шукаць Госпада Бога Ізраілевага*" (Эзра 6:21).

«*А па заканчэнні гэтага падыйшлі да мяне знатныя (людзі) і сказалі так: "Народ Ізраіля, і сьвятары, і левіты не аддзяліліся ад народаў краін: нечысціням (תּוֹעֵבָה) Кенаанеев, Хитийцев, Першеев, Йевусеев, Аманіцянаў, Маавіцянаў, Егіпцянаў і Эмореев…*"» (Эзра 9:1).

Гэта ўказвае на радавую дыстанцыю, якая існуе паміж гэтымі двума групамі: Ізраіль – сьвяты народ, усе астатнія народы – звычайныя, і яны не павінны быць змяшаныя [Washington 2003]. Таму скасаванне змяшаных шлюбаў з'яўляецца неабходным.

Акрамя таго, гэтыя ўрыўкі адлюстравалі аддзяленне абшчыны-гола ад прымешкі з "народаў зямлі (земляў)", імкненне да рытуальнай чысціні святароў, да выканання Торы, да паслушэнства Божаму загаду. Гэта паказвае здольнасць Ізраіля адрозніваць і аддзяляць чыстае ад нячыстага [Thiessen 2009, *78–79*].

Паняцце богаабранасьці яўрэйскага народа, народа Ізраіля, набывае ў персідскі перыяд асаблівае значэнне і актуальнасць. У той жа час уяўленне аб "чужым" (маецца на ўвазе ўсе, хто з'яўляюцца не "сваім") набывае больш яскравыя характарыстыкі і шырокае распаўсюджванне ў параўнанні з дапленным перыядам [Вейнберг 1973, *27*].

Радавая прырода іудзейскай ідэнтычнасці ў кнізе Эзры-Нехем'і, уяўленне аб адмысловым паходжанні "народа Ізраіля", патрылінейны лік сваяцтва прывялі і да рэлігійнага абгрунтавання гэтай ідэі.

| Тэрмін | Да плена | Пасля плена |
|---|---|---|
| Чужы | – іншага паходжання;<br>– варожае;<br>– іншай рэлігіі. | – не з народу Ізраіля;<br>– з іншай краіны;<br>– іншай рэлігіі. |
| Народы зямель | – іншапляменныя народы ўвогуле. | – крыніца мярзоты і рытуальнай нечысціні;<br>– найбольшая ступень супрацьпастаўлення;<br>– ворагі іудэяў. |

Другім элементам абшчыннага светапогляду аказваецца ідэалогія чысціні. Ідэалогія чысціні звязана з родавым мысленнем. Саўл М. Оліан бачыць яе сярод найбольш важных інструментаў фармавання ідэнтычнасці іудзейскай абшчыны. Хоць усе тэксты кнігі Эзры-Нехем'і маюць накіраванасць супраць "яны", яны фармулююць сваю пазіцыю да "іх" і змяшаных шлюбаў па-рознаму:

1) рыторыка нечысціні выкарыстоўваецца для аддзялення тых, хто лічыцца чужым для супольнасці;

2) часам, для той жа мэты, змяшаныя шлюбы выкрываюцца як святатацтва;

3) выкарыстоўваецца адмысловая "падзяляльная" тэрміналогія.

Рыторыка прымешкі, дзе гэта сустракаецца, адрозніваецца ад тэксту да тэксту. Мемуары Нехемы нічога не гавораць пра чужых, якія забруджваюць брыдотай, але радавод сьвятароў і левітаў апаганены праз змяшаныя шлюбы, а іх запаветы – парушаныя. Чужыя забруджваюць "рытуальна" праз фізічную прысутнасць.

У супрацьлегласць гэтаму ў кнізе Эзры забруджванне чужых заключаецца ў апаганенні мярзотамі. Калі мы прымаем здагадку, што Мемуары Нехем'і – больш

ранняя крыніца, то ідэя святатацтва, уяўленне, што змяшаныя шлюбы апаганьваюць святарскае паходжанне, і вера, што чужыя апаганьваюць "рытуальна", паўсталі на раннім этапе фарміравання абшчыны. Гэтыя ідэі паўсталі ў колах, дзе дамінавала рыгарыстычная, сепаратысцкая ідэалогія, накіраваная супраць "чужых". У канчатковым рахунку, з гэтых колаў выйшлі аўтары і рэдактары кнігі Эзры-Нехем'і [Olyan 2004, *14*].

Вавілона-персідская Дыяспара з'яўлялася духоўным, ідэалагічным і прызнаным афіцыйна цэнтрам кіравання іудзейскай абшчынай у Палестыне. Менавіта яна валодала "правільнай" рэлігійнай традыцыяй і правам "правільнага" яе тлумачэння. Варта адзначыць, што ў канцы персідскага перыяду крыніцай тлумачэння Закона для егіпецкай Дыяспары быў ужо Іерусалім. Менавіта туды іудэі Элефантыны адпраўлялі запыты з просьбай растлумачыць нюансы вядзення культу [Волков 1915, *10–11*].

Радавое мысленне трансфармавалася ва ўяўленне аб захаванні рытуальнай чысціні не толькі левітамі і святарамі, але і шэраговымі членамі іудзейскай абшчыны. У больш позні перыяд гэтыя ідэі атрымалі развіццё ў іудаізме, у тым ліку сучасным.

У больш позні, антычны перыяд многія іудэі былі вельмі заклапочаныя рытуальнай чысцінёй, баючыся метафізічнай заразы, якая пагражала святым месцам і святым прадметам. Храналагічным і геаграфічным ядром яўрэйскай рытуальнай чысціні быў Іерусалімскі Другі храм. Храм функцыянаваў па строгім законам рытуальнай чысціні, уключаючы градуяваную сістэму доступу, закліканую не падпускаць нячыстых. Аднак некаторыя групы лічылі нават Іерусалім недастаткова чыстым, як, напрыклад, кумраніты, якія заснавалі сваё паселішча ў раёне Мёртвага мора. Пытанні рытуальнай чысціні ў антычны перыяд падрабязна разглядаюцца ў працах Сцюарта С. Мілера "На скрыжаванні тэкстаў і матэрыяльных знаходак: ступеністыя басейны, каменны посуд і рытуальная чысціня ў яўрэяў рымскай Галілеі" [Miller 2015] і Міры Бальберг "Рытуальная чысціня, цела і асоба ў ранняй равіністычнай літаратуры" [Balberg 2014].

Такім чынам, родавае мысленне і імкненне захаваць рытуальную чысціню ўсіх чальцоў іудэйскай абшчыны былі адным з ключавых характарыстык абшчыннага светапогляду. Прыналежнасць да народу Ізраіля была абумоўлена толькі паходжаннем, а змяшаныя шлюбы разглядаліся як пагроза рытуальнага забруджвання ўсёй абшчыны. Крыніцай рытуальнай нечысціні ўяўляліся народы зямель. Законы захавання рытуальнай нечысціні распаўсюдзіліся на ўсіх чальцоў абшчыны.

## ЛІТАРАТУРА

*Вейнберг И. П.* Город в палестинской гражданско-храмовой общине VI–IV вв. до н. э. // **Древний Восток.** Ереван, *1973*.

*Волков И. М.* **Арамейские документы иудейской колонии на Элефантине V века до Р. Х.** Москва, *1915*.

*Balberg M.* **Purity, Body, and Self in Early Rabbinic Literature.** Berkeley, *2014*.

*Janzen D.* Scholars, witches, ideologues, and what the text Said: Ezra 9–10 and its interpretation // **Approaching Yehud: New Approaches to the Study of the Persian Period** / Ed. by J. L. Berquist. Atlanta, *2007*.

Miller S. S. **At the Intersection of Texts and Material Finds stepped Pools, Stone Vessels, and Ritual Purity among the Jews of Roman Galilee.** Göttingen, *2015*.

*Olyan S. M.* Purity ideology in Ezra-Nehemiah as a tool to reconstitute the community // **Journal for the Study of Judaism in the Persian, Hellenistic a. Roman Period.** *2004*. Vol. 35, No. 1.

*Strong J.* **A Concise Dictionary of the Words in the Hebrew Bible.** New York, *1890*.

*Thiessen M.* The function of a conjunction: inclusivist or exclusivist strategies in Ezra 6.19–21 and Nehemiah 10.29–30? // **Journal for the Study of the Old Testament.** *2009*. Vol. 34, No. 1.

*Washington H. C.* Israel's Holy Seed and the foreign women of Ezra-Nehemiah: a Kristevan reading // **Biblical Interpretation.** *2003*. Vol. 11, No. 3/4.

## REFERENCES

Weinberg I. P. (1973), "Gorod v palestinskoy grazhdansko-khramovoy obshchine VI–IV vv. do n. e.", in *Drevniy Vostok*, Yerevan, pp. 149–61. (In Russian).

Volkov I. M. (1915), *Arameyskiye dokumenty iudeyskoy kolonii na Elefantine V veka do R. Kh.*, Tovarishchestvo skoropechatni A. A. Levenson, Moscow. (In Russian).

Balberg M. (2014), *Purity, Body, and Self in Early Rabbinic Literature*, University of California Press, Berkeley.

Janzen D. (2007), "Scholars, witches, ideologues, and what the text Said: Ezra 9–10 and its interpretation", in J. L. Berquist (ed.), *Approaching Yehud: New Approaches to the Study of the Persian Period*, Society of Biblical Literature, Atlanta, pp. 49–69.

Miller S. S. (2015), *At the Intersection of Texts and Material Finds stepped Pools, Stone Vessels, and Ritual Purity among the Jews of Roman Galilee*, Vandenhoeck & Ruprecht, Göttingen.

Olyan S. M. (2004), "Purity ideology in Ezra-Nehemiah as a tool to reconstitute the community", *Journal for the Study of Judaism in the Persian, Hellenistic and Roman Period*, Vol. 35, No. 1, pp. 1–16.

Strong J. (1890), *A Concise Dictionary of the Words in the Hebrew Bible*, Abingdon Press, New York.

Thiessen M. (2009), "The function of a conjunction: inclusivist or exclusivist strategies in Ezra 6.19–21 and Nehemiah 10.29–30?", *Journal for the Study of the Old Testament*, Vol. 34, No. 1, pp. 63–79.

Washington H. C. (2003), "Israel's Holy Seed and the foreign women of Ezra-Nehemiah: a Kristevan reading", *Biblical Interpretation*, Vol. 11, No. 3/4, pp. 427–37.

*Г. В. Дзягель*

## РОДАВАЕ МЫСЛЕННЕ І ІДЭАЛОГІЯ ЧЫСЦІНІ Ў СВЕТАПОГЛЯДЗЕ ІУДЭЙСКАЙ АБШЧЫНЫ Ў ПЕРСІДСКІ ПЕРЫЯД (VI–IV СТСТ. ДА Н. Э.)

Родавае мысленне і ідэалогія чысціні з'яўляюцца аднымі з ключавых характарыстык, якія ўласцівыя светапогляду іудэйскай абшчыны ў Палесціне ў персідскі перыяд. Кніга Эзры-Нехем'і паказвае вельмі выразнае родавае мысленне народа Ізраіля. Адсюль сыходзіла патрабаванне разводу з неяўрэйскімі жонкамі і адмовы ад дзяцей, што нарадзіліся ў змяшаных шлюбах. З пункту гледжання кіраўніцтва абшчыны гэта быў адзіны шлях, каб пазбавіцца ад "прымесяў". Межы абшчыны былі непранікальныя і іх парушэнне ставіла пад

пагрозу рытуальную чысціню і ўсю абшчыну. Ізраіль – святое семя, усе астатнія народы – звычайнае семя. Абшчына адмяжоўвалася ад “народаў зямлі”, імкнулася да рытуальнай чысціні святароў, да выканання Закону. Асновай гэтага радавога, абшчыннага светапогляду была ідэалогія чысціні. У кнізе Нехем’і чужыя рытуальна забруджваюць абшчыну праз фізічную прысутнасць. У кнізе Эзры забруджванне заключаецца ў апаганенні “мярзотамі”. У больш позні, антычны перыяд ядром яўрэйскай рытуальнай чысціні быў іерусалімскі Другі храм. Родавае мысленне трансфармавалася ва ўяўленне пра захаванне рытуальнай чысціні не толькі левітамі і святарамі, але і простымі членамі іудэйскай абшчыны.

**Ключавыя словы:** ідэалогія чысціні, Іудэя, персідскі перыяд, дзяржава Ахеменідаў, іудэйская абшчына, яурэйская ідэнтычнасць

*Г. В. Дзягель*

## РОДОВЕ МИСЛЕННЯ ТА ІДЕОЛОГІЯ ЧИСТОТИ В СВІТОГЛЯДІ ЄВРЕЙСЬКОЇ ГРОМАДИ В ПЕРСЬКИЙ ПЕРІОД (VI–IV СТ. ДО Н. Е.)

Мислення предків та ідеологія чистоти є одними з ключових характеристик світогляду єврейської громади Палестини перського періоду. У книзі Ездри Неємії показано дуже чітке мислення предків ізраїльського народу. Звідси вимога до розлучення з неєврейськими дружинами та залишення дітей, народжених у змішаних шлюбах. З точки зору очільників громади, це був єдиний спосіб позбутися “домішок”. Межі громади були непроникними, і їхнє порушення загрожувало ритуальній чистоті та всій громаді. Ізраїль – святе насіння, всі інші народи – звичайне насіння. Громада відокремилася від “народів землі”, прагнула до ритуальної чистоти священиків, дотримання Закону. Основою цього родового, спільного світогляду була ідеологія чистоти. У книзі Неємії незнайомці ритуально забруднюють громаду фізичною присутністю. У книзі Езри забруднення оскверннням “мерзоти”. У пізніший, античний період, ядром єврейської ритуальної чистоти був Другий храм Єрусалиму. Загальне мислення трансформувалося в ідею збереження ритуальної чистоти не лише левітами та священиками, а й звичайними членами єврейської громади.

**Ключові слова:** ідеологія чистоти, Іудея, персидський період, Ахеменідська держава, єврейська громада, єврейська ідентичність